**І. І. Бамбешка,** *выкладчык*
*кафедры гісторыіі музеязнаўств*
*БДУ культуры і мастацтваў*

# ДЗЕЙНАСЦЬ КРЯЗНАЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПА ЗБОРЫ І ВЫВУЧЭННІ ТРАДЫЦЫЙНАГА ФАЛЬКЛОРУ БЕЛАРУСАЎ У 1920-я гг.

Падзеі лютага і кастрычніка 1917 г. выклікалі імклівае развіццё “масавага навукова-культурнага руху”. Так характарызавалася ў 1920-я гг. краязнаўства. У гэтыя гады скрозь па Беларусі ўзнікалі краязнаўчыя таварыствы, гурткі, музеі. Розныя па маштабах, яны ставілі перад сабой адзіныя задачы: сіламі грамадскасці ўсебакова вывучаць родны край, распаўсюджваць веды аб Бацькаўшчыне сярод шырокага кола насельніцтва. Дзейнасць гэтых арганізацый, якая працякала нярэдка пры адсутнасці іншых навуковых і культурных установ, пераўтварала іх, па распаўсюджаным тады выслоўі, у “акадэміі навук на месцах”. У іх рабоце найбольш важнымі былі збор і вывучэнне традыцыйнага аўтэнтычнага фальклору беларусаў.

Ужо першыя краязнаўчыя арганізацыі, акрамя асветніцкай работы, праявілі сябе ў справе збору аўтэнтычнага беларускага фальклору. Так, культурна-асветным таварыствам “Папараць-кветка”, якое існавала ў Слуцку ў перыяд з канца 1917 г. па лістапад 1920 г., былі арганізаваны збор і вывучэнне фальклорнага матэрыялу [16, с. 62]. Аднак дзейнасць таварыства была спынена ў 1920 г. У 1922 г. па ініцыятыве Слуцкага павятовага аддзела народнай асветы была створана Слуцкая павятовая камісія беларусазнаўства. Камісія разгарнула даволі шырокую дзейнасць па краязнаўчым вывучэнні мясцовасці. Сябрамі камісіі быў таксама працягнуты і збор фальклору. Камісіяй распрацоўваліся спецыяльныя анкеты для збору неабходнага матэрыялу і рассылаліся па Случчыне. У асноўным збор фальклору ажыццяўляўся настаўнікамі і вучнямі на месцах. Іншы раз гэта рабілася падчас экспедыцый, якія наладжваліся камісіяй [7, с. 62].

Зборам фальклорнага матэрыялу займаліся і сябры радзімазнаўчага гуртка ў м. Смалярск Ігуменскага павета [7, с. 60].

Даволі актыўна ў справе збору фальклору беларусаў працавалі і сябры створанай 9 лютага 1921 г. на аснове студэнцкага этнаграфічнага гуртка Этнаграфічнай камісіі пры этнаграфічным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кабінеце Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута. Яны не толькі назапашвалі эмпірычны матэрыял, але і спрабавалі нейкім чынам яго прааналізаваць і сістэматызаваць, што знайшло адлюстраванне ў падрыхтаваных дакладах і публікацыях. На пасяджэннях камісіі былі заслуханы такія даклады, як "Беларускія бытавыя малюнкі", "Бяседы і пасядзелкі Суражскага павета Віцебскай губерні" і інш. За час існавання камісіі яе сябрамі было сабрана 300 народных песень [10, с. 21]. Вынікі сваёй работы сябры камісіі змяшчалі ў машынапісным часопісе "Белорусский этнограф" [8, с. 176].

У пачатку 1920-х гг. у Беларусі існавалі і іншыя асяродкі краязнаўства, аднак звесткі аб іх дзейнасці ў дадзеным напрамку адсутнічаюць.

Больш шырока работа па зборы і вывучэнні фальклору краязнаўцамі разгарнулася пасля стварэння 29 снежня 1923 г. Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК), асноўныя функцыі якога заключаліся ў каардынацыі мясцовых краязнаўчых даследаванняў, іх арганізацыйнай і метадычнай падтрымцы.

Ужо першыя праграмы, падрыхтаваныя супрацоўнікамі ЦБК і Інстытута беларускай культуры (ІБК) і надрукаваныя ў краязнаўчым часопісе "Наш край", звярталі ўвагу краязнаўцаў і патрабавалі ад іх практычных дзеянняў у збіранні і вывучэнні вельмі шырокага кола пытанняў [12]. Значнае месца ў гэтых праграмах надавалася і пытанням фальклорнай спадчыны беларусаў. Яны рэкамендавалі сярод усяго іншага фіксаваць асаблівасці абрадаў, звычаяў, вераванняў і фальклору, прычым раілі больш надаваць увагі новым праявам у азначаных элементах культуры.

У наступныя гады супрацоўнікі адпаведных секцый і камісій Інстытута беларускай культуры падрыхтавалі і выдалі шэраг больш канкрэтных і спецыялізаваных праграм, інструкцый, анкет, скіраваных на вывучэнне розных аспектаў фальклору беларусаў. Гэта праграмы-інструкцыі для збірання беларускай музычна-этнаграфічнай [2] і вуснай народнай творчасці [13], вераванняў і ўяўленняў [9] і інш.

Пытанні збору і вывучэння фальклору краязнаўцамі абмяркоўваліся на краязнаўчых з'ездах і канферэнцыях. Так, на І Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе са спецыяльным інструкцыйным дакладам " Збіранне і апрацоўка фальклору" выступіў вядомы пісьменнік і даследчык М. І. Гарэцкі, у якім у

чарговы раз выказаў думку аб неабходнасці і важнасці даследавання беларускага фальклору. У дакладзе тэзісна вызначаліся асноўныя аспекты методыкі і арганізацыі збору фальклорнага матэрыялу, яго тэматычная і геаграфічная акрэсленасць [11, с. 85].

На II Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе з дакладамі па аналагічнай праблематыцы выступілі супрацоўнікі фальклорнай камісіі ІБК П. А. Бузук, сябра песеннай камісіі ІБК; даследчык беларускага песеннага фальклору А.А.Грыневіч і інш. [14, с. 82, 108].

Аб вартасці беларускага фальклору для вывучэння "першабытнай культуры і сьветапогляду" гаварыў вядомы беларускі даследчык-этнограф В. Ю. Ластоўскі ў сваім дакладзе "Стацыянарныя этнаграфічныя досьледы", выступаючы на II Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі [3, с. 50].

Аналіз справаздач і паведамленняў краязнаўчых арганізацый сведчыць, што мясцовыя краязнаўцы актыўна ўключыліся ў працэс збору беларускай фальклорнай спадчыны. Толькі за перыяд з лютага па верасень 1926 г. на адрас літаратурнай камісіі ІБК і ЦБК было даслана 5007 фальклорных запісаў [4, с. 88]. На II Усебеларускім з'ездзе ў справаздачным дакладзе намесніка старшыні ЦБК А.З.Казака адзначаецца, што за год (з лютага 1926 г. па люты 1927 г.) у літаратурную, а затым ў фальклорную камісіі ІБК было даслана 8565 запісаў [15, с. 13]. Увогуле за два гады (1925–1927) краязнаўчымі арганізацымі было даслана 11 804 экзэмпляраў вуснай народнай творчасці (песень, казак, загадак, прыказак і інш.) [5, с. 13]. У 1927–1928 гг. краязнаўцамі было сабрана 18 307 адзінак фальклорных запісаў [6, с. 60].

У наступныя гады ў сувязі з пераарыентацыяй даследчай дзейнасці краязнаўцаў колькасць фальклорных запісаў скарацілася. За 1929 г. краязнаўцамі было зафіксавана ўсяго 978 адзінак фальклорнага матэрыялу. Тым не менш на III Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі ў студзені 1930 г. адзначалася, што за перыяд з 1924 г. краязнаўчымі арганізацыямі было сабрана 46 000 фальклорных запісаў [18, с. 54–55].

У асобных выпадках краязнаўцы не толькі адсылалі ў ЦБК сабраныя імі фальклорныя запісы, але і самі спрабавалі іх сістэматызаваць і апрацаваць. Некаторыя з такіх даследаванняў былі надрукаваны ў краязнаўчым часопісе "Наш край" [17, с. 1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падводзячы вынікі дзейнасці краязнаўцаў ў 1920-я гг. у галіне збору і вывучэння традыцыйнага фальклору беларусаў, неабходна адзначыць, што яны ўнеслі станоўчы ўклад ў развіццё фалькларыстыкі, садзейнічалі перш за ўсё фарміраванню і пашырэнню яе крыніцазнаўчай базы. Аднак дадзеная работа вялася не заўсёды на адпаведным тэарэтычным і метадычным узроўні, увязвалася з дзейнасцю адпаведных ўстаноў і арганізацый, хоць і рабіліся пэўныя крокі, каб ліквідаваць адзначаныя недахопы.

---


1. *Гарбач, А. Д.* Рысы старога быту ў жыцці беларускіх сялянак у вёсках Шалавічы і Новыя наборкі Бабруйскай акругі і вёсках Дразды і Малішава Мазырскай акругі / А. Д. Гарбач // Наш край. – 1929. – № 3. – С. 46–52.

2. *Грыневіч, А.* Праграма-інструкцыя для збірання беларускай музычна-этнаграфічнай творчасці / А. Грыневіч // Наш край. – 1925. – № 1. – С. 45 – 48.

3. *II Усебеларуская* краязнаўчая конфэрэнцыя // Наш край. – 1929. – № 1. – С. 49–72.

4. *Інстытут* беларускай культуры. Гісторыя ўзнікнення. Сучасная структура. Навукова-даследчая дзейнасць / Апрац. А. І. Цвікевіч. – Мн.: Дзяржвыд. Беларусі, 1926. – 118 с.

5. *Казак, А.* Краязнаўства ў БССР к дзесяцігодзьдзю Кастрычнікавай рэволюцыі / А. Казак // Наш край. – 1927. – № 10. – С. 9–15.

6. *Казак, А.* Справаздача Цэнтральнага бюро краязнаўства / А. Казак // Наш край. – 1928. – № 5. – С. 55–61.

7. *Каспяровіч, М.* Краязнаўства / М. Каспяровіч. – Мн.: Белдзяржвыд., 1929. – 159 с.

8. *Каспяровіч, М.* Арганізаванае выўчэнне Беларусі ў XIX і пачатку XX сталецьця / М. Каспяровіч // Полымя. – 1928. – № 1. – С. 140–177.

9. *Мялешка, М.* Апытальны ліст да зьбірання народных вераваньняў і прадстаўленьняў, звязаных з каменем, і вестак аб каменных помніках гісторыка-археалагічнай значнасці / М. Казак // Наш край. – 1926. – №1. – С. 43–46.

10. *Мялешка, М.* Беларуская культурная праца на Вітабшчыне (этнаграфічная камісія пры этнаграфічным кабінэце Вітабскага археолёгічнага інстытуту) / М. Мялешка // Вестник Народного Комиссариата Просвещения С.С.Р.Б. – 1922. – № 5–6. – Беларускі аддзел. – С. 21–22.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. *Пастановы* Першага ўсебеларускага краязнаўчага зьезду 7–11 лютага 1926 г. у Менску // Наш край. – 1926. – № 2–3. – С. 82–87.

12. *Праграма* апісання паселішчаў гарадскога тыпу, гарадоў, мястэчак, гандлёвых сёл і г.д.// Наш край. – 1925. – № 1. – С. 56–58.

13. *Праграма* зьбірання вуснае народнае творчасьці // Наш край. – 1925. – №1. – С. 43 – 47.

14. *Працы* Першага ўсебеларускага краязнаўчага зьезду. 7–11 лютага 1926 г. – Мн.: Інбелкульт, 1926. – 83 с.

15. *Працы* Другога ўсебеларускага краязнаўчага зьезду. 10–13 лютага 1927 г. – Мн.: Інбелкульт, 1927. – 121 с.

16. *Пяцэвіч, Р.* Краязнаўчы рух на Случчыне / Р. Пяцэвіч, У. Мікіціцкі, П. Ажэўскі // Наш край. – 1928. – № 12. – С. 62–78.

17. *Самцэвіч, П. А.* Хрэсьбіны ў в. Інтальянка Барысаўскага раёну Менскай акругі / П. А. Самцэвіч // Наш край. – 1928. – № 11. – С. 34–42.

18. *Трэцяя* Усебеларуская краязнаўчая конфэрэнцыя // Наш край. – 1930. – № 2. – С. 50–69.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ